■ Факт

ВАЎКОЎ БОЛЬШ, ЛІСІЦ — МЕНШ

У лясах на Віцебшчыне ваўкоў стала больш прыкладна на 15%, колькасць янотападобных сабак павялічылася на 6,5%, а лісіц знізілася на 11,6%.

— За апошнія гады адзначаецца стабільны рост колькасці асноўных відаў паляўнічых жывёл. У прыватнасці, летась у параўнанні з 2012 годам колькасць лася ўзрасла на 4,3%, аленя — на 6,4%, казулі — на 4%, дзіка — на 5,2%. Колькасць бабра знізілася на 9,7%.

Што тычыцца жывёл са спіса Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь: барсук — зніжэнне колькасці на 2,9%, мядзведзь — колькасць практычна на ранейшым узроўні, рысь — павелічэнне на 15,3%. Гэта — даныя на 2013 год. Інфармацыі аб вынніках сёлетніх уліковых работ яшчэ няма, — расказвае «Звяздзе» **Васіль КІРПІЧОНАК, намеснік начальніка аддзела Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Афрыканская чума свіней стала прычынай масавага адстрэлу дзіка. Вядома, што дзікі кабан з'яўляецца пераносчыкам віруса. І калі апошні літаральна «гуляе» ў прыродзе, з ім складаней змагацца, чым з хворымі жывёламі на свінагадоўчых комплексах. Напрыканцы мінулага года ў Віцебскай вобласці з усіх каля 18,8 тысячы дзікоў засталося ў жывых каля 3,5 тысячы. І сёлета, па аператыўнай інфармацыі, больш як 90% з гэтай колькасці ўжо знішчаны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРАКЛАЛІ «ПРОСЕКІ» ЎЗДОЎЖ КАНАЛА...

Больш за паўсотні дрэў розных парод — вольхі, дубы, ясені, грабы, сосны, бярозы — незаконна высеклі на тэрыторыі Маларыцкага лясгаса работнікі мясцовага сельскагаспадарчага кааператыва.

— Для нарыхтоўкі дроў СВК атрымаў у лясгасе дазвол на высечку ўздоўж рэчышча меліярацыйнага канала. Аднак, прайшоўшы каля 50 метраў, работнікі вырашылі, што высякаць дрэвы каля самой вады — справа працаёмкая. Ды і для праезду транспарту расчысціць паласу не пашкодзіць, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Такім чынам, па абодва бакі канала былі «пракладзены» шырокія просекі даўжынёй некалькі соцень метраў. Пні дыяметрам ад 10 да 66 сантыметраў указваюць, што многія дрэвы нарыхтоўваліся зусім не на дровы. У СВК накіравана прэтэнзія з патрабаваннем пакрыць нанесеную навакольнаму асяроддзю шкоду. Згодна з папярэднімі разлікамі, яе сума складае каля 70 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Экалагічны вопыт

САКРЭТ СОТАК

Дачнікі могуць рэалізаваць на сваім участку праект па ўстойлівай гаспадарцы

Экалагічная ўстанова «Агра-Эка-Культура» пры падтрымцы Рэгіянальнага экалагічнага цэнтра (Венгрыя) абвяшчае конкурс на прыдатны для пілотнага праекта зямельны ўчастак. Тут спецыялісты плануюць стварыць дэманстрацыйную пляцоўку для навучання метадам дызайну і практычнага выкарыстання дружалюбных прыродзе практык земляробства ўстойлівай сельскай гаспадаркі.

ЯКІ ПАДЫХОД — ТАКІ І ЎРАДЖАЙ

Вядома, што на Беларусі больш распаўсюджаны інтэнсіўны метад гаспадарання. «Інтэнсіўная гаспадарка ў нашай краіне дасягнула сваёй мэты: сёння мы атрымліваем 30, а то і ўсе 90 цэнтнераў збожжа з гектара, — кажа Карней Доўбан, доктар сельскагаспадарчых навук. — Вялікія ўраджаі — заслуга мінеральных угнаенняў і хімічных сродкаў абароны. Пры такім падыходзе мы кормім расліны. Але чаму б не даць натуральнае харчаванне глебе і яе мікраарганізмам? Гэта будзе карысна і для зямлі, і для раслін, і для наваколля».

Вопыты Карнея Доўбана паказалі, што добры ўраджай грэчкі і бульбы можна атрымаць без хімікатаў, з выкарыстаннем зялёнага ўгнаення. Па якасцях культуры, вырашчаныя на натуральнай падкормцы, заўсёды намнога лепшыя (напрыклад, бульба атрымліваецца больш «крухмальнай»). Устойлівая гаспадарка дае сапраўды здаровы ўраджай і не шкодзіць наваколлю. Вядома, што пестыцыды, якія выкарыстоўваюцца ў інтэнсіўным гаспадаранні, забруджваюць глебу, ваду і тым самым шкодзяць здароўю чалавека.

ПРОСТА НАЗІРАЙЦЕ ЗА ПРЫРОДАЙ

Устойлівая гаспадарка звычайна лічыцца нерызыкоўнай, бо не залежыць ні ад кліматычных умоў, ні ад насення, ні ад хімічных прэпаратаў. Прынцыпы пермакультурнага (сістэмы вядзення сельскай гаспадаркі, заснаванай на ўзаемасувязях, што назіраюцца ў натуральных экасістэмах) дызайну вельмі простыя: вучыцца ў прыроды і супрацоўнічаць з ёй, а не змагацца, і браць на сябе адказнасць за зробленае. Максімальны эфект пры мінімальных унёсках сведчыць пра прадуманасць і многафункцыянальнасць гаспадарання. А біяразнастайнасць — крок да стварэння здаровай экасістэмы. Спецыялісты «Агра-Эка-Культуры» ўжо доўгі час знаёмяць беларускіх гаспадароў з прынцыпамі ўстойлівай гаспадаркі, але толькі на словах. «Вядомая ў свеце пермакультура Зэпа Хольцэра займела поспех дзякуючы таму, што людзі на ўласныя вочы бачаць яго ферму і на практыцы знаёмяцца з тэхналогіяй, — кажа Вольга Шчыглінская, каардынатар конкурсу. — Адной тэорыі мала, таму ў нас з'явілася ідэя паказаць перавагі цэласнага падыходу на эксперыментальнай гаспадарцы, якую выберам цягам конкурсу».

ЛАБАРАТОРЫЯ НА ТРОХ ГЕКТАРАХ

Нягледзячы на распаўсюджанасць інтэнсіўнай гаспадаркі, беларускія фермеры цікавяцца пермакультурай: напрыклад, у экапасяленнях (створаных для арганізацыі экалагічна чыстай прасторы для жыцця) толькі ёй і карыстаюцца. Тым не менш, арганізатары чакаюць заявак ад уладальнікаў агратурыстычных сядзіб, прысядзібных гаспадарак, навучальных устаноў, дач. Што да патрабаванняў — тэрыторыя павінна быць не меншая за паўгектара і не большая за тры. Перавага будзе аддавацца ўчасткам з разнастайным рэльефам, каб у арганізатараў была магчымасць паказаць як мага больш метадаў і тэхналогій. Сядзіба стане прадметам для вывучэння і, адпаведна, месцам паломніцтва для зацікаўленых людзей: гаспадары павінны мець магчымасць прыняць групу да 16 чалавек. Арганізатары забяспечваюць неабходным інструментам, тэхнікай, насеннем і пасадачным матэрыялам.

На працягу года гаспадар-пераможца і спецыялісты па ўстойлівай сельскай гаспадарцы створаць эскізны праект і пачнуць увасабляць яго на мясцовасці. На сайце «Агра-Эка-Культуры» будзе запушчаны анлайн-дзённік з дэталёвымі апісаннямі зробленага. Па заканчэнні праекта арганізатары плануюць выдаць метадычны дапаможнік «Аб стварэнні ўстойлівай гаспадаркі», якім зможа скарыстацца кожны ахвотны фермер ці дачнік.

Заяўкі на конкурс прымаюцца да 20 красавіка 2014 года па адрасе: agroecoculture@gmail.com. Больш інфармацыі пра конкурс можна атрымаць па тэлефоне + 375 29 694 30 59.

Кацярына РАДЗЮК

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.

ЯК ПАВЯЛІЧЫЦЬ УРАДЖАЙ?

Тыя, хто ўжо даўно мае свае ўласныя некалькі сотак, выдатна ведаюць усе сакрэты па вырошчванні раслін, іх доглядзе і зборы ўраджаю. Валодаючы «сваёй скарбонкай мудрасці», агароднікі з задавальненнем дзеляцца досведам з тымі, хто яшчэ толькі пачынае асвойвацца ў гэтай цікавай і карыснай справе.

Бульба

1) Каб атрымаць высокі ўраджай, клубні перад пасадкай на працягу 5 гадзін варта вытрымаць у часночным растворы: 1 кг часнаку дробна пасекчы і дадаць яго да 10 літраў вады. Раствор абеззаразіць клубні і будзе стымуляваць рост кустоў.

2) Пакідайце дастатковую колькасць месца для адной расліны. Часцей адбываецца наадварот: кусты вельмі блізка адзін да аднаго, ды яшчэ глыбока. У выніку чаго ўраджай не павялічваецца, як чакаецца, а нават памяншаецца. Віной таму прыгнёт адной расліны другой і недастатковая колькасць святла.

3) Варта пашыраць клубневую прастору. Робіцца гэта так: напрыклад, пры абганянні бульбы агароднікі парасткі ў куста папросту зблізаюцца адзін да аднаго. А лепш выдаліць слабыя, пакінуўшы 3-4 моцныя. Затым драцяным кругам (дыяметрам з футбольны мяч) трэба расправіць парасткі ў розныя бакі. За кошт гэтага ўраджай з аднаго куста значна павялічваецца.

4) Каб клубні пры зборы цешылі сваёй буйнасцю, неабходна праз два тыдні пасля цвіцення злёгку надламаць сцёблы. Пры гэтым лісце пачынае ўбіраць у сябе менш пажыўных рэчываў, а каранёвая сістэма, наадварот, працуе ва ўзмоцненым рэжыме, забяспечваючы і сілкуючы клубні ўсім неабходным.

Капуста

Каб дамагчыся высокага ўраджаю капусты, яе варта садзіць побач з бульбай. Па назіранні шматлікіх агароднікаў, качаны атрымліваюцца больш сакавітыя, роўныя і буйныя, чым тыя, што далёка ад бульбы. Таму саджайце капусту вакол бульбачкі або зрабіце граду пасярэдзіне. Не пашкадуеце.

Бурак

Вельмі часта ўраджай буракоў расчароўвае дачнікаў не столькі колькасцю, колькі якасцю. Вельмі часта яна вырастае не салодкая. Праблема вырашаецца наступным чынам: калі расліна ў вышыню дасягне 10—15 см, вырвіце лішнія, слабыя расліны, падкарміце буракі ў тры этапы. Для першай і другой падкормкі выкарыстоўвайце разведзены каравяк. А для трэцяй неабходна 1 ч.л. солі і 2 шклянкі попелу растварыць у вядры вады. Попел надасць караняплодам сілы, а соль — салодкасць.

Каб праверыць дзейснасць гэтых спосабаў, паспрабуйце іх спачатку на некалькіх раслінах і параўнайце вынік.

ГАРОХ... У ПІВОНІ

У дачнікаў кожны квадратны метр на ўліку — хочацца на невялікім кавалачку зямлі ўсяго і шмат. Таму, каб больш эфектыўна, па-гаспадарску выкарыстоўваць невялікую плошчу дачнага ўчастка для вялікага набору садовых, кветкавых і агароднінных культур, прымяняюцца розныя змешаныя і ўшчыльненыя пасадкі і пасевы.

Пры падборы кампанентаў гэтага змешанага вырошчвання ўлічваюцца сумяшчальнасць культур і іх індывідуальныя асаблівасці, у тым ліку патрабавальнасць кожнай культуры да ўмоў вырошчвання падчас вегетацыйнага перыяду.

Карыснае суседства

Удала сумяшчаецца вырошчванне зялёнага гароху «на лапатку» ў пасадках півоні. Пры гэтым гарох спрыяе ўзбагачэнню глебы азотам для півоні, а півоня спачатку абараняе ўсходы гароху ад птушак, а затым выконвае ролю апоры.

Для добрага развіцця кустоў півоні і атрымання прыгожых кветак вельмі важная забяспечанасць расліны пажыўнымі рэчывамі. Калі ў першыя два гады маладыя кусты нармальна развіваюцца без каранёвых падкормак, то ў далейшым патрэба ў падкормках узрастае. Патрэба ў азотных угнаеннях можа быць часткова пакрыта за кошт назапашвання азоту ў каранёвай сістэме гароху. Так, напрыклад, патрэба півоні трох-, сямігадовага ўзросту ў азоце складае 18-30 г на куст. Клубеньчыкавыя ж бактэрыі на каранях гароху здольныя ўзбагачаць глебу азотам у аб'ёме каля 3-5 г на куст півоні. Прычым азот, сканцэнтраваны на каранях гароху, размяшчаецца бліжэй да каранёвай зоны півоні (у адрозненне ад унесеных падкормак з разведзеных у вадзе мінеральных угнаенняў) і, натуральна, менш схільны да вымывання дажджавымі і талымі водамі.

Лепш «недадаць»

Варта ўлічыць, што вялікія дозы азоту зніжаюць устойлівасць кветак і ствараюць пагрозу пашкоджання півонь шэрай гніллю. Таму, прытрымліваючыся правіла «лепш недадаць, чым перадаць» у дачыненні азотных падкормак півоні можна паспяхова на працягу 2-3 гадоў абмежавацца толькі пасевам гароху ў каранёвай зоне півоні.

Гарох — расліна холадаўстойлівая. Яго насенне прарастае пры тэмпературы 1-4 градусы. Усходы ўстойлівыя да замаразкаў да -6 і інтэнсіўна растуць пры тэмпературы +15-20 градусаў. Таму высейваць гарох у півоні можна з красавіка да сярэдзіны мая. Тады да моманту зрэзвання кветак півоні парасткі гароху дасягнуць вышыні 10-20 см і будуць мець патрэбу ў апоры, ролю якой з поспехам выканаюць трывалыя сцёблы півоні.

Высейваць гарох можна адным або двума кругавымі радамі праз 10-15 см ад кустоў півоні. Адлегласць паміж насеннем пры двухрадковым пасеве — 7-10 см, пры аднарадковым — нават да 2 см.

Півоня і гарох аднолькава патрабавальныя да вільготнасці глебы і паветра, пераносяць кароткачасовыя засухі і не пераносяць пераўвільгатнення. Пакуль падрастае гарох, півоня ўжо адцвіце, а пасля гарох сваімі лісцем прыкрые пянькі півонь пасля зрэзвання кветак. У выніку такога сумеснага вырошчвання дэкаратыўнасці півоні не толькі не зменшыцца, а нават прыбудзе.

Хвалявацца пра тое, што гарох заслоніць святлолюбівыя півоні, не варта, таму што гэта прыцяненне цалкам дапушчальнае па ходзе развіцця і адбудзецца ў самы пік асветленасці сонцам (канец чэрвеня — ліпень). Даводзіць гарох, які расце ў півонях, да біялагічнай спеласці немэтазгодна. Лепш убраць яго цалкам на стадыі малочнай спеласці і вызваліць кусты півоні ад наземнай часткі гароху, зрэзаўшы яго на ўзроўні глебы, і тым самым забяспечыць звычайныя ўмовы асветленасці ў перыяд фарміравання пупышак аднаўлення півоні, які прыпадае на канец ліпеня — пачатак жніўня.

Эксперыментуйце!

Верагодна, такія ж станоўчыя вынікі можна атрымаць і пры пасеве гароху каля іншых шматгадовых кветкавых і лекавых раслін, якія маюць ўстойлівае сцябло. Калі ж вы абыякавыя да салодкага гарошку, але жадаеце атрымліваць асалоду ад прыемнага водару і пасля таго, як півоні адцвітуць, то замест агароднінага гароху можна такім жа чынам пасеяць духмяны гарошак.